С.В.Зыгмантовіч,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

Адной з формаў падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі з'яўляецца вытворчая практыка. Асноўваючыся на цесных узаемасувязях навучальнай установы і бібліятэкі, вытворчая практыка садзейнічае замацаванню і выкарыстанню студэнтамі атрыманых ведаў, іх прафесійнаму асэнсаванню і апрабацыі на вытворчасці, набыццю ўменняў рэалізоўваць набытыя веды ў канкрэтных вытворчых сітуацыях; спрыяе паглыбленню і развіццю прафесійных ведаў. Сёння склалася такая сітуацыя, калі бібліятэкі — базы практыкі — маюць сучасную і грунтоўную матэрыяльна-тэхнічную базу, ідуць наперадзе па ўкараненні новых інфармацыйных тэхналогій, што дае магчымасць студэнтам адчуць сябе ў новым інфармацыйным асяроддзі, значна пашырыць свае веды, сфарміраваць дадатковыя ўменні і навыкі. Вытворчая практыка дазваляе ацаніць правільнасць абранай прафесіі, сябе ў вытворчым калектыве, адчуць карпаратыўную культуру бібліятэчнай працы; з'яўляецца важным сродкам рэалізацыі міжпрадметных сувязей спецыяльных дысцыплін; дазваляе сфарміраваць у студэнтаў навыкі навуковай работы, звязаныя з асэнсаваннем вопыту канкрэтнай установы культуры, параўнальным аналізам іх дзейнасці, ажыццяўленнем назіранняў за работай вопытных супрацоўнікаў, удзелам у навуковых даследаваннях, якія праводзіць бібліятэка, або выкананнем на базе практыкі заданняў па курсавых і дыпломных работах; дае магчымасць паўплываць на матывацыю далейшай пазнавальнай дзейнасці студэнта, дазваляе зарыентавацца на больш актыўнае засваенне вывучаемага матэрыялу розных дысцыплін, на выбар і наведванне "курсаў па выбары", працяг навучання ў бакалаўрэаце ці магістратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З улікам усіх гэтых магчымасцей падыходзіць кафедра бібліяграфіі і дакументазнаўства да распрацоўкі праграм па арганізацыі вытворчай практыкі.

Адной з асноўных складаючых прафесійнай накіраванасці практыкі з'яўляецца бібліяграфічная падрыхтоўка студэнтаў.

Бібліяграфічны раздзел уключаецца ў праграму практыкі студэнтаў IV і V курсаў. У сувязі з тым, што студэнты на IV курсе ўпершыню праходзяць практыку, змест яе вызначаецца знаёмствам і набыццём ведаў, уменняў і навыкаў па ўсіх асноўных накірунках бібліяграфічнай дзейнасці ў канкрэтнай бібліятэцы, фарміраваннем цэласнага ўяўлення аб бібліяграфічнай дзейнасці.

Студэнты знаёмяцца з арганізацыяй бібліяграфічнай службы, са складам даведачна-бібліяграфічнага апарата (ДБА) бібліятэкі і бібліяграфічнага аддзела, асноўнымі ведамі, формамі і метадамі бібліяграфічнага абслугоўвання і фарміравання інфармацыйнай культуры спажыўцоў. У якасці практычных у праграме вызначаюцца заданні, накіраваныя на набыццё ўменняў і навыкаў па фарміраванні ДБА бібліятэкі, засваенне працэсаў і аперацый абслугоўвання па сістэме выбарчага распаўсюджвання інфармацыі, арганізацыі Дня інфармацыі, Дня спецыяліста, работы "дзяжурнага бібліёграфа" па прыёме, аналізе запытаў, пошуку інфармацыі па запытах і інш.

У праграме прадугледжваецца абавязковае авалоданне названымі бібліяграфічнымі працэсамі як у традыцыйным, так і ў аўтаматызаваным тэхналагічным рэжымах, падрыхтоўка тэхналагічных карт на асобныя формы, накірункі бібліяграфічнай дзейнасці. Уведзены заданні, якія садзейнічаюць фарміраванню ў студэнтаў навукова-даследчых навыкаў, звязаных з вывучэннем выкарыстання ДБА бібліятэкі, вызначэннем эфектыўнасці асобных формаў бібліяграфічнага абслугоўвання і навучання карыстальнікаў.

Бібліяграфічная складаючая праграм для студэнтаў V



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

курса распрацавана па асноўных накірунках дзейнасці бібліятэкі з улікам пэўных спецыялізацый. Але ўсе праграмы аб'ядноўвае агульная мэтавая накіраванасць: азнаёміцца, авалодаць уменнямі і навыкамі ажыццяўлення асноўных функцый кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю ў бібліятэцы і аказання метадычнай дапамогі бібліятэкам сваёй сеткі. Таму ў спецыяльным раздзеле праграмы "Бібліяграфічная дзейнасць" выдзяляюцца заданні, звязаныя з планаваннем, улікам бібліяграфічнай работы, выкарыстаннем маркетынгавых накірункаў па падрыхтоўцы асноўных каналаў збыту бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, іх рэкламе, вызначэннем эканамічных паказчыкаў дзейнасці бібліяграфічнага аддзела і інш.

У мэтах інтэнсіфікацыі вытворчай практыкі праграмай прадугледжваюцца: 1) напаўняльнасць заданняў практыкі, іх канкрэтны змест з улікам рэальных патрэб бібліятэк і планаў іх дзейнасці (як правіла, студэнтам даручаюцца даволі складаныя заданні, звязаныя з фарміраваннем баз даных, удзелам у правядзенні комплексных мерапрыемстваў, абслугоўваннем рэальных карыстальнікаў, у тым ліку і з выкарыстаннем магчымасцей Internet, што значна павышае адказнасць студэнтаў і прафесійны падыход да выкарыстання); 2) уключэнне заданняў, звязаных з аказаннем метадычнай дапамогі бібліятэкам, з публічнымі выступленнямі студэнтаў перад бібліятэкарамі (агляды спецыяльнай літаратуры, кансультацыі, абарона распрацаваных метадычных матэрыялаў і інш.); 3) публічная абарона вынікаў практыкі перад кіраўніцтвам бібліятэкі, дзе студэнты не толькі трымаюць справаздачу аб зробленым, але і выказваюць канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні работы бібліятэкі, выкладанні вучэбных курсаў ва універсітэце. Усё гэта патрабуе ад студэнта асэнсаваных адносін да сваёй вучэбнай і вытворчай дзейнасці.

Сярод асноўных накірункаў павышэння эфектыўнасці арганізацыі і правядзення вытворчай практыкі можна выдзеліць наступныя. Па-першае, неабходна ўключэнне ў вучэб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя планы вытворчай практыкі для студэнтаў ФБІС ужо з III курса. Менавіта на III курсе адбываецца выкладанне спецыяльных дысцыплін, па якіх звычайна праводзіцца вытворчая практыка. Замацаванне, пашырэнне атрыманых ведаў падчас практыкі садзейнічала б іх пераўтварэнню ў трывалыя ўменні і навыкі, спрыяла б больш паспяховай здачы экзаменаў. Па-другое, трэба аднавіць падвядзенне вынікаў практыкі студэнтаў IV — V курсаў ва універсітэце ў выглядзе навукова-практычных канферэнцый, што дасць магчымасць пашырыць свае ўяўленні аб дзейнасці бібліятэк, дзе яны не змаглі пабываць на практыцы, абагульніць і прадставіць цікавы вопыт, інавацыйныя накірункі дзейнасці бібліятэк, больш глыбока яго асэнсаваць. Кафедрам жа прадставіцца магчымасць сфарміраваць фонд такіх матэрыялаў для выкарыстання ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Па-трэцяе, з мэтай фарміравання больш высокага ўзроўню сацыяльна-прафесійных матываў бібліятэчнай дзейнасці можна прапанаваць распрацоўку і ўвядзенне ў якасці курсаў па выбары ці дысцыплін спецыялізацыі курс "Бібліятэчная прафесія". Па-чацвёртае, трэба перагледзець праграмы практыкі з мэтай выключэння іх дубліравання, змяншэння заданняў, арыентаваных на азнаямляльны характар дзейнасці.

Значнымі ўяўляюцца такія пытанні ў арганізацыі практыкі, як: суадносіны індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці студэнтаў падчас выкананняў; штодзённая адзнака іх дзейнасці з боку кіраўнікоў ад баз практыкі, аб'ектыўнасць канчатковай адзнакі, магчымасці параўнання аб'ёмаў і якасці выканання заданняў практыкі на розных базах; неабходнасць умацнення кантралюючых функцый савета па вытворчай практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ